УДК 001.8+37

***М.С. Кавалевіч***

# ПСІХОЛАГА-ПЕДАГАГІЧНАЯ ПАДТРЫМКА ПРАФЕСІЙНАГА САМАВЫЗНАЧЭННЯ Ў ЮНАЦКІМ УЗРОСЦЕ: ЗМЕСТ І СПОСАБЫ АРГАНІЗАЦЫІ

У артыкуле раскрываюцца змест і спосабы арганізацыі педагагічнай падтрымкі прафесійнага самавызначэння ў юнацкім узросце. Сярод іх інфармацыйна-экспертная, эмацыянальна-энергетызаваная, прафесійна-дзейсная, асобасна-развіццёвая падтрымка.

Псіхолага-педагагічная падтрымка разглядаецца як з'ява, працэс і вынік планамерных псіхолага-педагагічных узаемадзеянняў, якія служаць развіццю пазітыўнай скіраванасці асобы, яе мэт і матываў адносін да ўласнага жыцця і прафесійнай кар'еры.

Тэхналогія арганізацыі прафесійнага самавызначэння прадстаўлена як псіхолага-педагагічная падтрымка развіцця і самаразвіцця, карэкцыя індывідуальнага развіцця, выбару каштоўнасцяў, стымуляванне самаразвіцця.

Асоба аптанта і працэс яе прафесійнага самавызначэння даследуюцца як складаныя самаарганізаваныя сістэмы, якія могуць існаваць толькі ва ўмовах разнастайнасці, выпадковасці, спантаннасці і непрадбачанасці. Задача педагога заключаецца ў тым, каб знайсці механізм кіравання такімі сістэмамі і адпаведныя для гэтага метады і сродкі.

## Уводзіны

Магчымасць устойлівага развіцця грамадства ў многім вызначаецца ўзроўнем адукаванасці ўсіх яго членаў, асобаснымі якасцямі і здольнасцямі, якія развіваюцца ў працэсе адукацыі і правільна арганізаванага прафесійнага самавызначэння (ПСВ).

Педагагічная падтрымка старшакласнікаў у працэсе ПСВ характарызуецца як від педагагічнай дзейнасці, скіраваны на суправаджэнне працэсаў станаўлення індывідуальнасці і суб'ектнасці, на пераадоленне цяжкасцяў, на вызначэнне прафесійнага выбару, на фарміраванне ўласнай прафесійнай стратэгіі з улікам схільнасцяў, інтарэсаў і магчымасцяў асобы. Нельга не пагадзіцца з сучаснымі даследчыкамі праблем прафесійнага самавызначэння, што «адзін з шанцаў зрабіць тэорыю прафарыентацыі адпаведнай рэаліям культурамэтазгоднасці і адэкватнасці сацыяльна-эканамічным рэаліям – зрабіць спробу пабудаваць адпаведную ім канцэпцыю падтрымкі прафесійнага самавызначэння. Напрыклад, следам за «рызаматычнымі мадэлямі» ў адукацыі (В.Г. Тарасян) абгрунтаваць неабходнасць стварэння аналагічных мадэляў падтрымкі прафесійнага самавызначэння. Адна з асаблівасцяў педагагічнай падтрымкі ва ўмовах складанай інфармацыйнай прасторы заключаецца ў тым, што падтрымка не паддаецца алгарытмізацыі, яна заўсёды імаверна. М.Ф. Родзічаў абгрунтавана разглядае педагагічную падтрымку старшакласнікаў як кампенсацыю «недастатковасці і няўзгодненасці знешніх і ўнутраных рэсурсаў самаразвіцця пры паслядоўным прыняцці імі жыццёва важных рашэнняў» [1, с. 25–26]. Такая кампенсацыя прадугледжвае не загадзя прадвызначаную паслядоўнасць кампанентаў дзейнасці, а спосаб узгаднення праз дыялог спантаннага (выпадковага) і арганізаванага адукацыйна-прафесійнага асяроддзя.

Заўважана адна вельмі важная, на наш погляд, асаблівасць: калі для індустрыяльнай культуры характэрным з'яўляецца пошук свайго месца ў свеце тыповых рабочых месцаў, то для постіндустрыяльнай – *стварэнне ўласнага адукацыйна-прафесійнага «фармата»* шляхам камбінацыі прафесійных кампетэнцый [2].

Новыя спосабы прафарыентацыі, якія адпавядаюць запытам постіндустрыяльнага грамадства, толькі ствараюцца, бо ствараецца і само грамадства.

Пашыраецца практыка пастаноўкі прафесійнай задачы пад канкрэтнага спецыяліста, у якім зацікаўлена прадпрыемства. Адбываецца гэта таму, што вынiковасць яго работы вызначаецца не толькі і не столькі матэрыяльнай базай, але найперш кампетэнтнымі, а значыць канкурэнтназдольнымі спецыялістамі. Таму фармуліроўка «выбар прафесіі» замяняецца на «пошук рэсурсаў для выбару «ладу жыцця», ідэнтычнасці (як індывідуальных здольнасцяў) і «іміджу», а таксама навучанне спосабам выкарыстання гэтых рэсурсаў» [1, с. 25–26]. Абумоўлена гэта тым, што ў XXI ст. ніякіх устойлівых ведаў пра свет прафесій і прафесіяналаў не існуе. Знікаюць адны прафесіі, узнікаюць новыя (каля 500 штогод). Таму сэнс педагагічнай падтрымкі бачыцца ў стварэнні ўмоў для ўласнага сцэнарыя асобаснага і прафесійнага развіцця, выбару ў нестандартных сітуацыях. Таму нельга не пагадзіцца з прапановай М.Ф. Родзічава выкарыстаць у якасці канцэптуальнай ідэі педагагічнай падтрымкі ПСВ узаемаабумоўленасць двух падыходаў – *сацыяльна-адаптацыйнага і каштоўнасна-сэнсавага.*

Сацыяльна-адаптацыйны падыход выкарыстоўваецца для забеспячэння старшакласніка сродкамі сістэматызацыі інфармацыі аб варыянтах пасляшкольнай адукацыі і прафесійнай будучыні, для пераадолення асобасных цяжкасцяў. Вынікам такой падтрымкі становіцца адказ на пытанні, прадвызначаныя кан’юнктурай рынку працы і рынку адукацыйных паслуг.

У аснове каштоўнасна-сэнсавага падыходу – арыентацыя на пошук каштоўнасцяў і сэнсаў будучай адукацыйна-прафесійнай дзейнасці. Важным з’яўляецца сам працэс узнікнення маральнай гатоўнасці да прафесійнага выбару. «Стаць суб’ектам выбару – значыць зрабіць нешта па ўласнай, а не чужой ініцыятыве» [1, с. 25–26]. Гэтыя два альтэрнатыўныя падыходы ўзаемадзейнічаюць у працэсе педагагічнай падтрымкі ПСВ па прынцыпе ўзаемадапаўняльнасці і адпавядаюць сацыяльнаму заказу грамадства і індывідуальным патрэбам асобы, якая самавызначаецца ў свеце прафесій.

**Змест і спосабы арганізацыі педагагічнай падтрымкі ПСВ у юнацкім узросце**

Паводле тэорыі педагогікі свабоды В.С. Газмана, педагагічная падтрымка – гэта сумеснае з вучнямі вызначэнне іх інтарэсаў, мэт, магчымасцяў і шляхоў пераадолення цяжкасцяў (праблем), якія перашкаджаюць ім захаваць сваю чалавечую годнасць і самастойна дасягаць жаданых вынікаў у навучанні і самавызначэнні [3]. Прадметам педагогікі свабоды ў адрозненне ад педагогікі неабходнасці з’яўляюцца спосабы самапазнання, пазнання самога сябе, а не толькі пазнанне навуковай карціны свету. Педагогіка свабоды вывучае чалавека як суб’екта выбару, які чалавек ажыццяўляе ў адносінах да сябе, да ўласнай асобы. Арганізуючы педагагічную падтрымку асобы ў ПСВ, педагог арыентуецца на вучня як на ўнікальную духоўную «самасць» і дапамагае яму як суб’екту свабоднага выбару, суб’екту самавызначэння рэалізаваць сваё жыццёвае прызначэнне, ажыццявіць экзістэнцыяльны выбар.

У сувязі з гэтым аўтар канцэпцыі педагагічнай падтрымкі прафесійнага самавызначэння школьнікаў звяртае ўвагу на некарэктнасць прымянення методыкі, заснаванай на класіфікацыі прафесій паводле прадмета працы, для дыягнастычных мэтаў. Такая методыка заснавана на «жорсткім дыягностыка-рэкамендацыйным падыходзе», які садзейнічае станаўленню пасіўнай пазіцыі старшакласніка ў ролі «вядомага», дазваляе зняць адказнасць за ўласны прафесійны выбар. Падобныя методыкі рэкамендуецца выкарыстоўваць для абмеркавання *магчымай варыятыўнасці і разнастайнасці* сацыяльна запатрабаваных відаў дзейнасці

Разумеючы змест педагагічнай падтрымкі як пераадоленне перашкод, вылучаюць суб’ектыўныя (асобасныя) «Я»-перашкоды, сацыяльныя «Яны»-перашкоды і матэрыяльныя перашкоды. Асобасныя «Я»-перашкоды звязаны з недастатковасцю для асобы першаснай інфармацыі, інфармацыі аб сваіх асобасных якасцях і аб свеце

прафесій, цяжкасцямі ў самапазнанні, праблемамі фізічнага або псіхічнага развіцця. Падтрымка заключаецца ў адказах на ўзнікшыя пытанні, дапамозе ў развіцці матывацыі і самаарганізацыі, выкарыстанні новых сродкаў для рашэння праблемы.

Сацыяльныя «Яны»-перашкоды – сацыяльнае асяроддзе – педагогі, сябры, аднагодкі, сям'я, рэкамендацыі якіх трэба ўлічваць, мэтазгодна да іх прыслухацца, але зрабіць выбар асэнсавана і самастойна.

Матэрыяльныя перашкоды (матэрыяльны стан сям'і, фінансавыя праблемы) могуць аказаць значны ўплыў на рэалізацыю прафесійнага выбару. Але тут мэтазгодна арыентавацца не на прэстыж ВНУ, а на ўласныя магчымасці ў рэалізацыі пастаўленай мэты: і ў правінцыяльнай ВНУ можна атрымаць добрую адукацыю, была б мэта, вялікае жаданне і працавітасць.

Гуманістычная каштоўнасць педагагічнай падтрымкі – у арыентацыі педагога на развіццё матывацыйна-сэнсавай сферы вучня, на праблемы асобы, якая самавызначаецца, шукае сваё месца ў жыцці. У сумесных дзеяннях, супрацоўніцтве з дарослымі развіваецца матывацыйна-сэнсавая сфера, фарміруецца каштоўнаснае стаўленне да свету, да іншых людзей, да сябе, узнікаюць самакантроль і самаарганізацыя. Псіхалагічны сэнс педагагічнай падтрымкі – стварэнне ўмоў для самаразвіцця [4].

З арганізацыйнай пазіцыі педагагічная падтрымка ПСВ можа быць прадстаўленая этапамі сумеснай дзейнасці педагога і аптанта з мэтай дапамогі ў вырашэнні праблем прафесійнага выбару.

Для асобы, якая самавызначаецца, педагагічная падтрымка прадугледжвае падтрымку яе індывідуальнасці, незалежнасці і рацыянальнасці. Падтрымка нейкі час дапамагае кампенсаваць няўпэўненасць, трывогу, неадэкватныя паводзіны, ствараючы тым самым умовы для самастойнага рашэння праблемы жыццёвага і прафесійнага самавызначэння. Кампетэнтны педагог выступае ўмовай развіцця жыццёвых сіл, фарміравання веры ва ўласныя магчымасці на этапе прафесійнага выбару.

Прафарыентацыйную падтрымку мы разглядаем як дзейнасць педагога і аптанта па аказанні дапамогі ў развіцці скіраванасці асобы, яе каштоўнасных арыентацый, мэт, матываў, інтарэсаў, схільнасцяў і здольнасцяў, стварэнне ўмоў для асобаснага і прафесійнага росту, самавызначэння і практычнай спробы сіл. У гэтай сувязі «адна з важных задач прафкансультанта – арганічнае спалучэнне інтарэсаў асобы, якая самавызначаецца, і інтарэсаў грамадства, у якім чалавек імкнецца знайсці сваё месца» [5, с. 5].

У залежнасці ад асобасных праблем, якія ўзнікаюць у аптанта на этапе прафесійнага выбару, адрозніваюць інфармацыйна-экспертную, эмацыянальна-энергетызаваную, прафесійна-дзейсную, асобасна-развіццёвую падтрымку [6, с. 22]. *Інфармацыйна-экспертная падтрымка* адпавядае патрабаванням старшакласнікаў у папаўненні ведаў у вобласці псіхалогіі і прафесіялогіі. Яна дае магчымасць суаднесці асобасныя якасці з патрабаваннямі прафесіі, пашырыць імавернасны арэал магчымага выкарыстання здольнасцяў і схільнасцяў. Вучні падчас самастойнага пошуку і падтрымкі педагога збіраюць прафесіяграфічныя звесткі і спрабуюць знайсці звесткі аб уласных асобасных якасцях метадам самапазнання. Зместам прафарыентацыйнай падтрымкі на гэтым этапе з'яўляецца сумеснае абмеркаванне са старшакласнікамі інфармацыі аб прафесіях і выніках самадыягностыкі.

*Эмацыянальна-энергетызаваная падтрымка* старшакласнікаў адпавядае патрабаванням у прыняцці жыццёвых каштоўнасцяў і эмацыйнальным заахвочванні жаданняў і жыццёвых мэт. Зместам прафарыентацыйнай падтрымкі з'яўляецца дыягностыка матывацыйнай сферы, валявога кампанента самасвядомасці, узроўню самаацэнкі і дамаганняў. У выпадку няўзгодненасці мэт, матываў і каштоўнасцяў

неабходна дапамагчы аптанту заняць рэфлексіўную пазіцыю адносна ўласнай жыццёвай перспектывы.

*Прафесійна-дзейсная падтрымка* старшакласнікаў дапамагае правільна ажыццявіць выбар. Падтрымка арыентавана на сцвярджэнне або адмаўленне выбару. Эфектыўным у гэтым выпадку будзе практычная спроба сіл і абмеркаванне вынікаў у кірунку перспектыўнасці намаганняў у абраных відах дзейнасці. Эфектыўнымі ў мэтах прафесійна-дзейснай падтрымкі з'яўляюцца экскурсіі-практыкумы, выкананне заданняў па назіранні за прадстаўнікамі прафесійнай сферы, выкананне прасцейшых прафесійных абавязкаў разам з дарослымі.

*Асобасна-развіццёвая падтрымка* эфектыўна на этапе пераасэнсавання жыццёвага вопыту, жыццёвых перспектыў, змены каштоўнасных арыентацый. На гэтым этапе старшакласнікам можа спатрэбіцца і дадатковая псіхалагічная і (або) прафесіязнаўчая інфармацыя, эмацыянальная падтрымка, практычная спроба сіл, рэфлексіўнае асэнсаванне сітуацыі. Тут важнымі з'яўляюцца асобасныя якасці педагога як прыклад пераадолення жыццёвых цяжкасцяў.

*З сінергетычных пазіцый* педагагічная падтрымка – гэта *ўключэнне вучняў у працэсы іх уласнага развіцця.* Педагог становіцца здольным стварыць умовы для ўзнікнення творчай самаарганізацыі, ён валодае метадамі нелінейнай арганізацыі складанай самарэфлексіўнай сістэмы, разумее сінергетычны сэнс важнейшай каштоўнасці рэфлексіўнай арганізацыі і кіравання працэсам ПСВ – педагагічнай падтрымкі і стымулявання пераходу аб'ектаў кіравання ў статус суб'ектаў.

Новая парадыгма арганізацыі працэсу ПСВ заключаецца ў тым, што яно разглядаецца як адкрытая сацыяльна-педагагічная сістэма, якая існуе ў межах новых сацыяльных і сацыяльна-педагагічных каштоўнасцяў, стварэнне ўмоў для развіцця асобы, здольнай да самавызначэння і самаактуалізацыі.

У юнацкім узросце актуальнымі для развіцця становяцца задачы незалежнага існавання. Для іх ажыццяўлення неабходны ўменні і навыкі арганізацыі ўласнага асобаснага і прафесійнага жыцця. У юнацтве актывізуецца прафесійнае самавызначэнне чалавека, набываецца тая ступень псіхічнай, ідэйнай і грамадзянскай сталасці, якая робіць яго здольным да самастойнага працоўнага жыцця і дзейнасці, фарміруецца ўменне складаць уласныя жыццёвыя планы, знаходзіць сродкі іх рэалізацыі. Ключавым наваўтварэннем юнацкага ўзросту становіцца *прафесійнае самавызначэнне* як усведамленне сябе, уласнай пазіцыі ў адносінах да прафесійнай дзейнасці, з прычыны якога і здзяйсняецца зроблены прафесійны выбар; працэс самастойнага і свядомага знаходжання сэнсаў прафесійнага выбару і ўсёй жыццядзейнасці ў пэўнай культурна-гістарычнай (сацыяльна-эканамічнай) сітуацыі, а таксама знаходжанне сэнсу ў самім працэсе самавызначэння.

Юнак добра разумее, што змест і якасць будучага жыцця найперш залежаць ад таго, ці здолее ён правільна выбраць прафесію. Таму выбар прафесіі – яго галоўны і пастаянны клопат. Юнацтва – гэта ўзрост, калі фарміруецца светапогляд, каштоўнасныя арыентацыі, устаноўкі, перыяд, калі ажыццяўляецца пераход ад дзяцінства да дарослага жыцця, атрыбутамі якога з'яўляюцца адказнасць, самастойнасць, здольнасць да актыўнага ўдзелу ў жыцці грамадства і ў сваім асабістым жыцці, да канструктыўнага рашэння праблем прафесійнага станаўлення. Юнацкі узрост, паводле Э. Эрыксана, будуецца вакол працэсу ідэнтычнасці, які складаецца з серыі сацыяльных і індывідуальна-асобасных выбараў, ідэнтыфікацыі, прафесійнага станаўлення [7].

Уласная самасць адкрываецца перад чалавекам як прадмет рэфлексіі. З гэтага моманту можна меркаваць аб самаразвіцці суб'ектыўнасці як асобай духоўнай рэальнасці, цэнтральным утварэннем якой з'яўляецца суб'ектнасць. Гэта «чалавек для сябе» (Л.С. Выгоцкі) як альтэрнатыва быццю для чагосьці іншага – матэрыяльнага

ўзбагачэння, грошай, улады, бессэнсоўнага існавання і – як умова самавызначэння і самарэалізацыі. Філасофска-антрапалагічная канцэпцыя аддае чалавеку ў распараджэнне яго быццё і ўскладае на яго поўную адказнасць за самаажыццяўленне. Паказчыкам антрапалагічнай сталасці лічыцца здольнасць чалавека будаваць уласную праграму жыццядзейнасці.

Вучэбная дзейнасць у гэтым узросце пераходзіць на новы ўзровень, калі раскрываецца яе сэнс як дзейнасці па самаўдасканаленні і самаадукацыі. Вучэнне набывае асобасны сэнс, што з'яўляецца найважнейшым элементам пачуцця дарослых, на аснове якога юнак асэнсоўвае сябе як вядомае адзінства, параўноўвае сябе з іншымі, будуе свае адносіны з імі, арганізуе сваю дзейнасць. Менавіта ў гэтым узросце фарміруецца асэнсаванае імкненне выкарыстаць свае магчымасці, выявіць сябе, унесці ўклад у агульную справу, абвастраецца патрэба ў каштоўнасным і прафесійным самавызначэнні. Чалавек існуе не толькі «для сябе», але і «для іншых». Матываваная патрэба ў самавызначэнні і самарэалізацыі з'яўляецца асноўнай [8; 9].

Падагульняючы, можна сказаць, што сутнасць самавызначэння ў юнацкім узросце заключаецца ў тым, што асоба пачынае ўсведамляць сябе, сваю непаўторнасць, імкнецца знайсці сваё месца ў агульнай плыні жыцця («мы ў іншых»). Усё гэта гістарычна папярэднічае сваёй глыбокай сувязі і адзінству з навакольнымі людзьмі, а праз іх – з усім чалавецтвам. На гэтым узроўні адбываецца самавызначэнне ў стаўленні да жыцця ў цэлым, праводзіцца «свая лінія ў жыцці» [10]. Узнікае патрэба ў разуменні свайго месца ў грамадстве, патрэба ў самаактуалізацыі і пошуку сэнсу ўласнага існавання. Рост рэфлексіі, павышанай цікавасці да сябе тыповы для ранняй юнацкасці (інтрапсіхічнае «Я»). Адкрыццё сябе як непаўторнай індывідуальнай асобы непарыўна звязана з адкрыццём сацыяльнага свету і свету прафесій як яго неад'емнай часткі, у якім гэтай асобе трэба жыць. Ажыццяўляеццаператварэнне наяўнага быцця ў сваё. Нараўне з лёсам знешнім асоба набывае лёс унутраны (Гесэн).

Аналізуючы заканамернасці развіцця асобы ў юнацкім узросце, вучоныя (Л.І. Бажовіч, І.С. Кон, Э. Эрыксан) адзначаюць і ўзнікаючыя цяжкасці:

- псіхалагічныя, звязаныя з праблемай фарміравання часавай перспектывы;
- сацыяльныя, звязаныя з матэрыяльнымі праблемамі, неэфектыўнасцю развіцця грамадства;
- педагагічныя, звязаныя з распрацоўкай тэхналогій прысваення прафесійных ведаў і спосабаў дзейнасці [7–9].

Мэта псіхолага-педагагічнай падтрымкі асобы ў прафесійным самавызначэнні заключаецца ў паступовым развіцці ў яе ўнутранай гатоўнасці да свядомага і самастойнага планавання, карэкціроўкі і рэалізацыі перспектыў свайго развіцця, гатоўнасці разглядаць сябе чалавекам, які развіваецца ў рамках вызначанага часу, сацыякультурнай прасторы і сэнсу.

М.С. Пражнікаў прапанаваў змястоўна-працэсуальную мадэль прафесійнага самавызначэння асобы:

- Усведамленне каштоўнасці грамадска-карыснай працы і неабходнасці прафесійнай падрыхтоўкі (каштоўнасна-маральная аснова самавызначэння).
- Арыенціроўка ў сацыяльна-эканамічнай сітуацыі і прагназаванне прэстыжнасці выбіраемай працы.
- Агульная арыенціроўка ў свеце прафесійнай дзейнасці і вылучэнне прафесійнай мэты-мары.
- Інфармаванне аб прафесіях і спецыяльнасцях, якія адпавядаюць вучэбным праграмам прафесійных вучэбных устаноў і будучаму працаўладкаванню.
- Вызначэнне бліжэйшых прафесійных мэт як этапаў і шляхоў да дальняй мэты.

• Уяўленне аб перашкодах, якія ўскладняюць дасягненне прафесійных мэт, а таксама веданне сваіх магчымасцяў, спрыяльных рэалізацыі ўласных планаў і перспектыў.

• Наяўнасць сістэмы рэзервовых варыянтаў выбару на выпадак няўдачы па асноўным варыянце самавызначэння.

• Практычная рэалізацыя асабістай прафесійнай перспектывы і пастаянная карэкціроўка намечаных планаў паводле прынцыпу зваротнай сувязі [5, с. 17–18].

Прафесійнае самавызначэнне кардынальна ўплывае на змест жыцця асобы, і не толькі на яго прафесійны кампанент, але і на перспектывы стварэння сям'і, і на матэрыяльны стан, і на псіхалагічную гармонію, самаацэнку і ўзаемаадносіны з самім сабой – адным словам, на ўсе бакі жыцця чалавека. Прафесійнае самавызначэнне – найважнейшы этап сацыялізацыі асобы. У сувязі з гэтым неабходна падчас прафесіязнаўчай і псіхалагічнай падтрымкі ўважліва адносіцца да жыццёвых прыярытэтаў, каштоўнасных арыентацый, светапогляду маладых людзей, а таксама іх сацыяльнага самаадчування, настрою.

Аналізуючы працэс прафесійнага станаўлення асобы, Э.Ф. Зээр вылучае асноўныя характарыстыкі прафесійнага самавызначэння:

• прафесійнае самавызначэнне – гэта дыферэнцаванае стаўленне да свету прафесій у цэлым і да абранай прафесіі ў прыватнасці;

• ядром прафесійнага самавызначэння з'яўляецца асэнсаваны выбар прафесіі з улікам сваіх асаблівасцяў і магчымасцяў, патрабаванняў прафесійнай дзейнасці і сацыяльна-эканамічных умоў;

• прафесійнае самавызначэнне ажыццяўляецца на працягу ўсяго прафесійнага жыцця: асоба рэфлексіруе, пераасэнсоўвае сваё прафесійнае быццё і самасцвярджаецца ў прафесіі;

• актуалізацыя прафесійнага самавызначэння асобы ініцыіруецца рознага роду падзеямі, такімі як заканчэнне агульнаадукацыйнай школы, прафесійнай вучэбнай установы, павышэнне кваліфікацыі, змена месца жыхарства, атэстацыя, звальненне з працы і інш.;

• прафесійнае самавызначэнне з'яўляецца важнай характарыстыкай сацыяльна-псіхалагічнай сталасці асобы, яе патрэб у самаактуалізацыі [11, с. 105].

У цэлым працэс усведамлення асобай сваёй самакаштоўнасці, каштоўнасцяў і сэнсу свайго прафесійнага выбару, прафесійнай дзейнасці, яе значэння для самога сябе і ролі ў грамадскай сістэме вытворчых адносін разглядаецца як прафесійна-асобаснае самавызначэнне чалавека [6]. Псіхолага-педагагічная падтрымка разглядаецца як з'ява, працэс і вынік планамерных псіхолага-педагагічных узаемадзеянняў, якія служаць:

• дыягностыцы асобасных якасцяў, інтарэсаў, схільнасцяў і здольнасцяў;

• развіццю пазітыўнай скіраванасці асобы, яе мэт і матываў па стаўленні да ўласнага жыцця і прафесійнай кар'еры;

• умацаванню наяўных і ўтварэнню новых адносін і сувязяў з іншымі людзьмі ў групах з падобнымі інтэлектуальнымі характарыстыкамі і скіраванасцю асобы;

• актывізацыі намаганняў чалавека ў ажыццяўленні ўласнага асобаснага і прафесійнага сцэнарыя.

Даследчыкі вылучаюць:

1. *Рэтраспектыўную (кампенсатарную) педагагічную падтрымку,* якую яшчэ называюць прафесійнай пераарыентацыяй. Праца ў гэтым кірунку праводзіцца пры неабходнасці змяніць скіраванасць навучання ў сувязі са зменай жыццёвых перспектыў. Рэтраспектыўная педагагічная падтрымка дазваляе вызначыць больш

эфектыўныя кірункі прафарыентацыйнага суправаджэння і знайсці спосабы паспяховага самавызначэння канкрэтнай індывідуальнасці.

Для ажыццяўлення такой работы паспяхова ўжываюцца разнастайныя дыягнастычныя методыкі, індывідуальныя карэкцыйныя прафкансультацыі. Рэтраспектыўная падтрымка – гэта так званая «спозненая прафарыентацыя». Яна па сутнасці ёсць пераарыентацыя на іншую спецыяльнасць з карэкціроўкай першапачаткова скажоных дамаганняў. Зразумела, што працэс прафесійнай пераарыентацыі патрабуе падтрымкі з боку псіхалагічнай службы з-за таго, што звязаны з негатыўнымі перажываннямі пераацэньвання жыццёвага шляху і дыскрэдытацыі ўжо наяўных намераў.

2. *Сітуатыўную педагагічную падтрымку,* якая дапамагае рашэнню неадкладных задач размеркавання навучэнцаў па класах з улікам іх інтэрасаў і запытаў. Сітуатыўныя мерапрыемствы па арганізацыі педпадтрымкі дапамагаюць тэрмінова вырашаць узнікшыя цяжкасці і спрыяюць распаўсюджванню прафесіяграфічнай і псіхалагічнай інфармацыі.

Для паспяховага ажыццяўлення работы ў гэтым кірунку ўжываюцца дыягнастычныя метады даследавання інтэлекту, інтарэсаў і схільнасцяў, а таксама аналіз прадуктаў дзейнасці і групавая экспертная ацэнка. На гэтым этапе не абысціся без фарміравання станоўчай матывацыі да выбару непрэстыжнай, але грамадска неабходнай, перспектыўнай у плане працаўладкавання прафесіі. Вялікае значэнне тут маюць метады назірання і натуральнага эксперымента, падчас якіх вызначаюцца выяўленасць і перспектывы развіцця арганізатарскіх, камунікатыўных, валявых якасцяў, дзелавітасці, адказнасці, пачуцця абавязку і інш.

3. *Прэвентыўную педагагічную падтрымку*, якая праводзіцца з мэтай апярэджвання неспрыяльнай сітуацыі прафесійнага выбару, што дазваляе зберагчы дзяржаўныя сродкі, а таксама эмацыянальныя рэсурсы навучэнцаў і іх бацькоў. З гэтай мэтай ажыццяўляецца прафесіязнаўчае і псіхалагічнае інфармаванне, а таксама раннія прафесійныя спробы падчас экскурсій-практыкумаў. Напрыклад, у Японіі да моманту завяршэння школы кожны навучэнец (у адпаведнасці з патрабаваннямі праграмы навучання!) павінен выканаць прасцейшыя прафесійныя дзеянні не менш як па 86 прафесіях [12].

Прэвентыўную педагагічную падтрымку рэкамендуецца праводзіць са старшакласнікамі, арыентаванымі на атрыманне тых прафесій, па якіх на рынку працы маецца празмернасць спецыялістаў. Гэта, як правіла, без практычнага вопыту эканамісты, юрысты, перакладчыкі.

Самым спрыяльным варыянтам прэвентыўнай педагагічнай падтрымкі з'яўляецца прафарыентацыйная праца са школьнікамі па вызначэнні дыяпазону магчымасцяў і прагназаванні развіцця кожнай з наяўных прафесійных перспектыў. Даследчыкі адзначаюць, што нават пры наяўнасці сур'ёзных фізіялагічных абмежаванняў засваенне жаданых прафесій адбываецца за кошт актуалізацыі кампенсатарных механізмаў [6]. Вялікае значэнне для паспяховага ажыццяўлення прэвентыўнай падтрымкі маюць *прафесіяграфічныя метады.* Яны дапамагаюць пазнаёміцца са зместам магчымай прафесійнай дзейнасці. Асабліва гэта тычыцца тых прафесій і пасад, змест якіх школьнікам практычна невядомы (аналітык, аўдытар, брокер, іміджмейкер, круп'е, лагістык, мерчэндайзер, рэкруцёр, рыэлтар і інш.).

У працэсе даследавання ўстаноўлена: працэс педагагічнага ўзаемадзеяння з'яўляецца больш эфектыўным ва ўмовах стварэння праблемнай сітуацыі, якая забяспечвае няўстойлівасць сістэмы прафесійнага выбару, актывізацыю асобы і, як вынік, шматварыянтнасць развіцця сістэмы ў ходзе разгортвання працэсу самаарганізацыі. Таму неабходнай умовай прыняцця аптымальнага рашэння з'яўляецца стварэнне актыўнага, нераўнаважнага асяроддзя, што дасягаецца паступленнем у

сістэму прафесіяграфічнай і псіхалагічнай інфармацыі, якая можа быць атрымана аптантам як самастойна, так і з дапамогай педагога.

Педагагічны працэс арганізацыі ПСВ ёсць суб'ект-суб'ектныя адносіны, пры якіх аб'ект уздзеяння мае свае мэты, інтарэсы, волю. І ён неадназначна рэагуе на педагагічныя ўздзеянні. У адкрытай дысіпатыўнай сістэме ўзаемаадносін педагог – аптант дасягнуты вынік залежыць ад вялікай колькасці фактараў, ён нелінейны, таму яго нельга прадбачыць. Эфектыўнасць педагагічнай падтрымкі залежыць ад узгодненасці, сінхранізацыі дзеянняў абодвух бакоў, сінергетызму педагагічнага ўзаемадзеяння. Крыніцай і рухальнай сілай развіцця і самавызначэння асобы з'яўляецца яе ўласны сінергетызм і сінергетызм узаемадзеяння з педагогам, якія ўтвараюць сінергетычную сістэму.

Кіраванне педагагічнай сістэмай мае свае межы і заўсёды звязана з рызыкай, як адрэагуе аб'ект уздзеяння. Таму мэтазгодна факт рызыкі легалізаваць, каб можна было ўздзейнічаць на ход рызыкоўнай сітуацыі. Рызыка ў прагназаванні сітуацыі прафесійнага выбару заўсёды ёсць, бо абсалютныя веды пра свет прафесій і асобасныя якасці аптанта немагчымы. Нespадзяваны ход гэтага працэсу ёсць заўсёды. Вынікам педагагічнай падтрымкі аптанта ў ідэальным варыянце з'яўляецца прагнастычны сцэнарый магчымага асобаснага і прафесійнага развіцця. Але трэба адрозніваць увогуле непрадбачаныя з'явы ад непрадбачаных, але прадбачымых. Вядомы феномен аб'ектыўнай выпадковасці, наступленне якой так або інакш непазбежна. Прыклад такой выпадковасці – узнікненне новых прафесій, змена месца жыхарства, новыя сямейныя абставіны, што можа прывесці да неабходнасці вырашэння праблемы чарговага прафесійнага самавызначэння. Іншая справа – памылкі, суб'ектыўныя пралікі, якіх можна было б пазбегнуць. Выбар прафесіі «за кампанію» – памылка, якой можна было б не дапусціць.

У апошні час асоба даследуецца з пазіцый сінергетыкі і ўяўляецца як дысіпатыўная сістэма, якая можа існаваць (фізічна і духоўна) толькі за кошт пастаяннага абмену з асяроддзем рэчавым, энергіяй і інфармацыяй. Яна спалучае парадак з хаосам, здольная да самаарганізацыі і адкрытая да ўздзеяння навакольнага асяроддзя, характарызуецца нераўнаважнасцю [13].

Як з сінергетычнага пункту гледжання выглядаюць суадносіны працэсу самаарганізацыі і арганізацыі ў працэсе прафесійнага самавызначэння? Навука і практыка кіравання доўгі час фарміраваліся ў рамках класічнай дэтэрмініcцкай парадыгмы, у аснове якой уяўленне пра свет як раўнаважную сістэму. Лінейнае вымярэнне прыродных і сацыяльных працэсаў стварыла ілюзію магчымасці мэтаскіраванага праектавання будучыні складаных «аб'ектаў кіравання» і атрымання неабходных «суб'екту кіравання» вынікаў у адпаведнасці з запланаванымі. У выніку склалася практыка жорсткага кіравання. «Задача такога кіравання – захаванне ўстаноўленага парадку і яго аднаўленне пры парушэннях» [14, с. 190].

Некласічная навука будуецца на іншых парадыгмальных уяўленнях аб працэсах кіравання. Аб'екты кіравання тут характарызуюцца шматузроўневай арганізацыяй, масавым стахастычным узаемадзеяннем элементаў, існаваннем зваротных сувязяў, што забяспечваюць цэласнасць сістэмы. Лінейнасць, падтрымка ўстаноўленага парадку, закрытасць, пастаянства, захаванне – усё гэта кібернетычныя паняцці раўнаважнай дынамікі.

У постнекласічнай навуцы на першым плане сінергетычныя ідэі і паняцці адкрытасці, нераўнаважнасці, нелінейнасці, атрактарнасці, доўгатэрміновага дзеяння. Арганізацыя педагагічнай падтрымкі ўяўляецца не як заспакаенне руху жыцця, а як арганізацыя жыццядзейнасці ў нераўнаважным асяроддзі. Арганізаваць працэс прафесійнага выбару – гэта значыць забяспечыць пастаўленыя мэты сродкамі. Суб'ект арганізацыі ўключаецца ў жыццё асобы, яе праблемы і рэалізуецца ў працэсе

арганізацыі педагагічнага асяроддзя, якое ён стварае. Аб'ект і суб'ект кіравання ў такім выпадку не супрацьпастаўляюцца, а сінергуюцца. Прынцыпова здымаецца сама ідэя жорсткай лінейнай апазіцыйнасці аб'екта і суб'екта, і на яе месцы фарміруецца ідэя працэсуальнасці спантанных суб'ект-суб'ектных адносін, у працэс даследавання ўключаецца «праблематычны працэсуальны аб'ект». На аснове сучаснай версіі постмадэрнізму ў педагогіцы ўсталёўваецца ідэя не толькі і не столькі ўмешвання педагога ў працэс прафесійнага выбару, колькі ідэі арыентацыі на выкарыстанне спантанна ўзнікшых у працэсе самаарганізацыі асобасных структур. Педагагічнае ўзаемадзеянне павінна быць скіравана на тое, каб запусціць механізмы самаарганізацыі, іманентна характэрныя асобе старшакласніка. Пры гэтым педагог павінен улічваць далікатнасць механізму самаарганізацыі, а педагагічнае ўздзеянне павінна ўзгадняцца з яго гуманнай сутнасцю, у адваротным выпадку яно разбурыць самаарганізацыю. Педагог павінен умець успрымаць і слабыя або выпадковыя сігналы, што ўплываюць на працэс ПСВ, і стымуляваць станоўчыя тэндэнцыі ў развіцці асобы, улічыўшы і аптымальна спалучыўшы асобасныя і грамадскія інтарэсы, забяспечыўшы сінергетычны эфект. Зберажэнне балансу ўстойлівасці і няўстойлівасці, інтарэсаў асобы і інтарэсаў грамадства павінна характарызаваць новыя адносіны паміж творчымі працэсамі асобы, якая самавызначаецца, і педагагічным кіраўніцтвам гэтымі працэсамі.

Прастора прафесійнага выбару паўстае дынамічным полем узаемадзеянняў, жыццёвых падзей, асобасных змен, дзе бесперапынна змяняюцца параметры парадку. Параметры парадку, якія спантанна ўзнікаюць у пунктах біфуркацыі, узгадняюць асобасныя і грамадскія інтарэсы і набываюць значэнне кіравальных фактараў. Так у сінергетычным працэсе самаарганізацыі, арганізацыі і кіравання ствараецца самакіравальны працэс прафесійнага самавызначэння. Фактарам руху выступаюць асобасныя атрактары – індывідуальныя арыенціры стварэння ўласнай прафесійнай перспектывы (інтарэсы, каштоўнасці і здольнасці).

Пры даследаванні працэсу самавызначэння асобы як працэсу самаарганізацыі і самаразвіцця трэба ўлічваць яго ўзаемадзеянне са знешнім асяроддзем (педагогі, бацькі, равеснікі, сродкі масавай інфармацыі і інш.). Ад педагога як творчай асобы вучні ўспрымаюць паток інфармацыі і энергіі, якае актывізуе працэсы самавызначэння і самаразвіцця суб'екта будучай прафесійнай дзейнасці, вядзе асобу да стану роздумаў і канструктыўнага хаосу.

Аптант можа выступіць у якасці дысіпатыўнай сістэмы, якае мае мноства ступеняў свабоды. Пры ўзаемадзеянні сістэмы са знешнім асяроддзем адбываецца памяншэнне ступеняў яе свабоды. У гэтым і заключаецца сутнасць самаарганізацыі. Адбываецца разумнае абмежаванне свабоды прафесійнага выбару. Тут важнае значэнне мае аптымальнае спалучэнне самастойнасці выбару і педагагічнае кіраўніцтва ім. Галоўнае – не перайсці мяжу, за якой пачынаецца сілавое рашэнне праблемы, а самаарганізацыя становіцца прымусовай арганізацыяй.

У нашым даследаванні прафесійнае самавызначэнне выступае ў якасці асобай формы, састаўной часткі сацыяльнага жыцця чалавека, яго быцця, а тэхналогія арганізацыі прафесійнага самавызначэння – як псіхолага-педагагічная падтрымка развіцця і самаразвіцця, карэкцыя індывідуальнага развіцця, выбару каштоўнасцяў, стымуляванне самаразвіцця.

Пад сінергетычным асяроддзем мы разумеем спецыяльна створаную сістэму ўмоў для арганізацыі прафесійнага самавызначэння старшакласнікаў, якая спрыяе развіццю прафесійнай самасвядомасці і асобаснаму развіццю. Узаемадзеянне і ўзаемаадносіны педагогаў і навучэнцаў набываюць характар узаемадзеяння, скіраванага на самаразвіццё асобы кожнага. Псіхалагічны клімат інавацыйнай установы, ствараючы матывы, стымулы самаарганізацыі кожнаму, прад'яўляе высокія

патрабаванні да кожнага. Гэта тычыцца і навучэнцаў, і педагогаў, іх прафесійна-асобасных якасцяў. Адукацыйнае асяроддзе выступае матыватарам самаарганізацыі і педагогаў, і навучэнцаў, якія як самаарганізаваныя сістэмы валодаюць вялікай колькасцю ступеняў свабоды для самаарганізацыі.

**Заключэнне**

У сувязі з вышэйсказаным становіцца зразумела, чаму асноўны акцэнт варта рабіць на ўзмацненні апераджальнага ўздзеяння прафарыентацыйнай дзейнасці ў агульнаадукацыйнай школе. Менавіта дзякуючы ўзмоцненаму прафарыентацыйнаму складніку адукацыйная падрыхтоўка старшакласнікаў скіравана на рашэнне адразу некалькіх задач.

Па-першае, прафарыентацыйная работа садзейнічае працэсу самавызначэння школьнікаў у кірунку пабудовы жыццёвых планаў, дапамагае ім у развіцці неабходных асобасных якасцяў, у выбары прафесіі і засваенні прафесіяграфічных і псіхалагічных ведаў.

Па-другое, прафарыентацыйная работа дае магчымасць выбару для паглыбленага вывучэння школьных прадметаў, неабходных для далейшай вучобы або работы, скарачаючы тым самым выдаткі на рэпетытарства і падрыхтоўчыя курсы ва ўстановах вышэйшай і сярэдняй прафесійнай адукацыі.

Па-трэцяе, прафарыентацыйная работа стымулюе актыўнасць маладых людзей у плане арыентацыі на рынку працы з улікам запытаў рэгіёна, прымушае больш рэалістычна падыходзіць да сваіх здольнасцяў і магчымасцяў – іх дыягностыкі, развіцця, прымянення.

Значная роля ў развіцці і самавызначэнні старшакласніка як суб’екта працоўнай і будучай прафесійнай дзейнасці адводзіцца прафесійнаму самаразвіццю педагога, бо для педагогікі развіцця асаблівую каштоўнасць уяўляюць чалавечыя здольнасці самастойна мысліць, дзейнічаць, самастойна развівацца.

Паклаўшы ў аснову прафесійнага самавызначэння прынцып узаемадзеяння педагога і аптанта, мы разглядаем педагагічную падтрымку аптанта ў сітуацыі выбару як псіхолага-педагагічную дзейнасць, скіраваную на актывізацыю прафесійнага самавызначэння ва ўмовах педагагічнага ўзаемадзеяння. Педагагічная падтрымка аптанта ў полі ўзаемадзеяння дае яму магчымасці самастойнага пошуку індывідуальнай прафесійнай перспектывы, а пры неабходнасці ён можа атрымаць дапамогу ў прафесійным выбары.

Развіццё імкнення да самаарганізацыі, самавызначэння павінна быць галоўнай задачай педагога, таму што толькі на аснове самаарганізацыі можна дасягнуць канчатковай мэты. Пры гэтым важнейшай умовай «запуску» працэсаў самаарганізацыі і самавызначэння з’яўляецца стварэнне ў сістэме актыўнага нераўнаважнага асяроддзя. Найбольш перспектыўным для гэтых мэтаў з’яўляецца выкарыстанне *пазіцыйнага прынцыпу* (Г.І. Каспяровіч) арганізацыі сумеснай дзейнасці педагога і аптанта. Сумесная дзейнасць пры рэалізацыі пазіцыйнага прынцыпу скіравана на выяўленне і сутыкненне разнастайных пазіцый старшакласнікаў на адну і тую ж праблему пры арганізацыі групавой работы. Механізмам эфекту такой групавой работы з’яўляецца ідэя канструктыўнага канфлікту, вырашэнне якога садзейнічае знаходжанню аптымальных стратэгій рашэння задач. Пазіцыйны прынцып можа быць рэалізаваны праз размеркаванне розных пазіцый паміж старшакласнікамі, абмен пазіцый па ходу вучэбнай работы, сутыкненне супрацьлеглых пазіцый і іх канкурэнтны адбор. Такім чынам, магчыма характарыстыка гэтага прыёму ў тэрмінах сінергетыкі і яго выкарыстанне ў мэтах самаарганізацыі і самавызначэння.

Педагагічная падтрымка прадугледжвае педагагічную і псіхалагічную дапамогу ў індывідуальным развіцці і самаразвіцці аптанта як суб’екта будучай прафесійнай

дзейнасці. Аптант у працэсе прафесійнага самавызначэння выступае як саўдзельнік, суарганізатар сумеснай дзейнасці, скіраванай на дасягненне асобасна- і грамадска-каштоўнасных мэтаў. Асновай педагагічнай падтрымкі з'уляецца духоўны кантакт прафкансультанта і аптанта. Менавіта ад гэтага залежыць эфектыўнасць педагагічнага ўзаемадзеяння ў прафесійным самавызначэнні. Пры гэтым важна, каб змест прафесіяграфічнага і псіхалагічнага матэрыялу, формы, метады і сродкі прафарыентацыйнай дзейнасці на кожнай новай стадыі адпавядалі рэальным і патэнцыяльным магчымасцям старшакласнікаў, выступалі фактарам матывацыі прафесійнага выбару. Асоба аптанта і працэс яе прафесійнага самавызначэння – складаныя самаарганізаваныя сістэмы, якія могуць існаваць толькі ва ўмовах разнастайнасці, выпадковасці, спантаннасці і непрадбачанасці. Задача педагога заключаецца ў тым, каб знайсці механізм кіравання такімі сістэмамі і адпаведныя для гэтага метады і сродкі.

Аналогія арганізацыі з арганізмам стала асновай для стварэння арганізацыйнай канцэпцыі, згодна з якой у арганізацыі ўсё павінна быць ураўнаважана і звязана так, каб штучныя элементы і працэсы максімальна супадалі з прыроднымі. Пры такой арганізацыі дзеці і дарослыя развіваюцца гарманічна і пераадольваюцца іх бінарныя апазіцыі, забяспечваецца карэляцыя штучнага і натуральнага ў арганізацыі працэсу прафесійнага выбару. Задача арганізацыі – максімальна пашырыць агульны спектр педагагічнага ўздзеяння і ўнутраных тэндэнцый сістэмы і ўзмацніць іх сінергетычны эфект, стварыць умовы для развіцця асобы, свабоды выбару шляхоў развіцця. Сінергетычны падыход сведчыць, што для складаных сістэм, да якіх мы адносім дзейнасць педагога і аптанта, існуе некалькі альтэрнатыўных шляхоў развіцця, магчымасць выбару шляхоў далейшага развіцця, якія з'яўляюцца мэтазгоднымі з пункту гледжання як аптанта, так і педагога.

А для гэтага педагог павінен асэнсаваць сутнасць сваёй новай ролі раўнапраўнага ўдзельніка самаарганізаванага працэсу прафесійнага самавызначэння, беражліва адносіцца да выбараў старшакласнікаў і толькі з дапамогай своечасовых тактычных педагагічных уздзеянняў ажыццяўляць арганізацыю працэсу ў патрэбным кірунку ў прасторы магчымых альтэрнатыў.

## СПІС ЛІТАРАТУРЫ

1. Родичев, Н.Ф. Обоснование концепции педагогической поддержки профессионального самоопределения школьника / Н.Ф. Родичев // Новые ценности образования.– М. : [б. и.], 2006. – Вып. 1–2 / 25–26 : Образовательная деятельность. – С. 234–251.

2. Олекс, О.А От дистанционного центра профориентации на страницах журнала – до веб-сайта ABITURIENT/BY / О.А. Олекс // Народная асвета. – 2007.– № 12. – С. 8–10.

3. Газман, О.С. Педагогика свободы: путь в гуманистическую цивилизацию XXI века / О.С. Газман // Новые ценности образования. – Вып. 6. – М. : Педагогика, 1996. – С. 10–37.

4. Асмолов, А.Г. Образование как расширение возможностей развития личности (От диагностики отбора к диагностике развития) / А.Г. Асмолов, Г.А. Ягодин // Вопросы психологии. – 1992. – № 1–2. – С. 6–13.

5. Пряжников, Н.С. Профессиональное и личностное самоопределение. Методы активизации / Н.С. Пряжников. – Мозырь : Белый ветер, 1998. – 152 с.

6. Черникова, Т.В. Профориентационная поддержка старшеклассника : учеб.-метод. пособие / Т.В. Черникова.– М. : Глобус, 2006. – 256 с.

7. Erikson, E.H. Identity: Youth and Crisis / E.H. Erikson. – New York, 1968. – 336 p.

8. Кон, И.С. Психология ранней юности : книга для учащихся / И.С. Кон. – М. : Просвещение, 1989. – 225 с.

9. Божович, Л.И. Избранные психологические труды. Проблемы формирования личности / Л.И. Божович ; под ред. Д.И. Фельдштейна. – М. : Междунар. педагог. академия, 1995. – 209 с.

10. Абульханова-Славская, К.А. Стратегия жизни / К.А. Абульханова-Славская. – М. : Мысль, 1991. – 229 с.

11. Зеер, Э.Ф. Психология профессий : учебное пособие для студентов вузов / Э.Ф. Зеер. – М. : Академический Проект ; Екатеринбург : Деловая книга, 2003. – 336 с.

12. Fukuyama, Sh. A Philosophical Foundation of Vocational Guidance / Sh. Fukuyama. – Ashiya, Hyogo, Japan : Ashiya Univ. Press, 1988.

13. Кавалевіч, М.С. Прафесіянальнае самавызначэнне асобы: сінергетычны аспект / М.С. Кавалевіч // Народная асвета. – 2001. – № 3. – С. 3–9.

14. Касперович, Г.И. Синергетические концепции управления : курс лекций / Г.И. Касперович. – Минск: Акад. управления при Президенте Респ. Беларусь, 2005. – 258 с.

***Kovalevich M.S.*** **Psychological and Pedagogical Support of Professional Self-Identification in Teen-Age: Content and Ways of Organization**

The content and ways of organization of pedagogical support of professional self-identification in teen-age are revealed in the article. Among them there are informative and examining, emotional and energizing, professional and occupational, personal and developmental types of support.

Psychological and pedagogical support is viewed as a phenomenon, process and result of planned psychological and pedagogical cooperation, which help to develop person’s positive orientation, aims and motives of treatment of one’s life and professional career.

The technology of organization of professional self-identification is presented as psychological and pedagogical support of development and self-development, correction of individual development, choice of values, encouraging of self-development.

The aptant’s person and the process of his self-identification are studied as complex self-organized systems, which can exist only in conditions of diversity, fortuity, spontaneity and unpredictability. The teacher’s task is to find a mechanism to manage these systems and corresponding methods and ways to do it.

Рукапіс паступіў у рэдкалегію 14.10.2010